• оптимизация структуры высшего образования и системы учреждении высшего образования;

• повышение конкурентоспособности высшей школы Беларуси в мировом образовательном пространстве;

• совершенствование механизма финансирования УВО и оплаты труда профессорско-преподавательского состава.

Большинство мер предполагает внесение изменений в действующую нормативную правовую базу, прежде всего в Кодекс Республики Беларусь об образовании. В рамках широкой общественной дискуссии в 2014 г. Министерство образования сформировало пакет изменений и дополнений в Кодекс об образовании.

Таким образом, высшая школа БССР пережила в период своего становления не одну реформу, при этом многие из них не были успешными, часто их проводили без учета международного и национального опыта. Изучение истории проводимых реформ в системе образования на территории Беларуси не только позволяет суммировать накопленные знания, но и предоставляет возможность с точки зрения имеющегося опыта осуществить оценку рисков проведения оптимизационных мероприятий и выработать наиболее адекватные и взвешенные подходы к проведению реформ в сфере национального образования.

**Список использованных источников**


1. *Купайгородская, А. П.* Советская высшая школа в 1917–1927 гг.: автореф. дис. … д-ра ист. наук: 07.00.02 / А. П. Купайгородская; Ин-т истории СССР. – Ленинград, 1990. – 32 с.
2. *Раманава, I. M.* Фарміраванне савецкай сістэмы адукацыі ў БССР: 1921–1930 гг.: аўтарэф. дыс. … канд. гіст. навук: 07.00.02 / І. М. Раманава; Ін-т гісторыі НАН Беларусі. – Мінск, 1999. – 20 с.
3. *Хотеенков, В. Ф.* Роль Всесоюзного комитета по высшему техническому образованию в формировании советской системы высшей технической школы: 1932–1936 гг.: автореф. дис. … канд. ист. наук: 07.00.02 / В. Ф. Хотеенков; Моск. Ордена Ленина и Ордена Трудового Красного Знамени гос. пед. ин-т имени В. И. Ленина. – М., 1982. – 16 с.
4. *Хрипков, В. М.* Развитие высшего технического образования в Белорусской ССР: автореф. дис. … канд. пед. наук: 07.00.02 / В. М. Хрипков; Первый Моск. гос. пед. ин-т иностр. языков. – М., 1955. – 22 с.


**(Дата подачи: 17.03.2015 г.)**

*С. М. Токць*
Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Я. Купалы, Гродна
*S. M. Tokts*
Yanka Kupala Grodno State University, Grodno

**УДК 94(476)«1861–1914»**

## МОЛАДЗЬ У ПАРЭФОРМЕННАЙ БЕЛАРУСКАЙ ВЁСЦЫ (1861–1914): ЗМЕНЫ Ў МАДЭЛІ САЦЫЯЛІЗАЦЫІ



## YOUTH IN POST-REFORM BELARUSIAN VILLAGE (1861–1914): CHANGES IN THE MODEL OF SOCIALIZATION

*У артыкуле разглядаюцца змены мадэлі сацыялізацыі сялянскай моладзі ў беларускай вёсцы ў пасляэрэформенны перыяд. Моладзь у гэты час станавілася ўсё больш незалежнай ад старэйшага пакалення. Узрастала яе роля ў грамадскім жыцці вёскі. У маладых сялян з'яўляліся новыя жыццёвыя перспектывы, звязаныя з магчымасцю атрымання адукацыі і павышэння свайго сацыяльнага статусу. Маладыя вяскоўцы ўсё больш актыўна выязджалі на заробкі за межы сваёй малой радзімы. Разам з тым нарасталі і праявы дэвіянтных паводзін у моладзевым асяроддзі. Сялянская моладзь з бяднейшых малазямельных сямей не бачыла магчымасцяў для паляпшэння свайго матэрыяльнага становішча ў вёсцы. Яе прадстаўнікі асабліва ахвотна падтрымлівалі радыкальныя сацыяльныя ідэі і рэвалюцыйны рух.*
*Ключавыя словы: сялянства; сацыяльны статус; сацыякультурныя змены.*

*This article discusses the changes in the model of socialization of young peasants in the Belarusian village in the post-reform period. Youth is becoming more independent from the older generation. Increased its role in the social life of the village. Young farmers were able to obtain a new education and social status. Young residents actively go to work outside their village. At the same time increases and the number of manifestations of deviant behavior among young people. Peasant youth of the land-poor and landless families did not see the possibility to improve their financial situation in the country. Its representatives eagerly absorbed radical social ideas and supported the revolutionary movement.*
*Key words: peasants; youth; social status; social and cultural changes.*

У другой палове XIX – пачатку XX ст. у жыцці беларускай вёскі адбываюцца вельмі істотныя сацыяльныя і культурныя змены. Гэтыя змены ў асаблівай ступені закранулі такую ўзроставую групу вясковага насельніцтва, як моладзь. Менавіта маладыя сяляне найбольш востра адчувалі на сабе праблемы і супярэчнасці пераходнага перыяду, калі традыцыйныя мадэлі паводзін і архаічныя інстытуты паволі саступалі месца новым нормам і звычаям. Мэтай дадзенага артыкула стала вызначэнне характару зменаў ролі і месца сялянскай моладзі ў жыцці парэформеннай беларускай вёскі, зменаў у мадэлі сацыялізацыі маладога пакалення.

Узроставая катэгорыя моладзі ў сялянскім грамадстве не мела дакладнага акрэслення. Перыяд дзяцінства заканчваўся ў вёсцы прыкладна ў 15–16 год. У дарэформенны перыяд дзяўчаты ва ўзросце 16 год ужо павінны былі адбываць паншчыну разам з дарослымі жанчынамі (хлопцы ішлі на паншчыну ў 18 год), а таксама маглі выходзіць замуж. І хлопцы, і дзяўчаты ў 15 гадоў павінны былі выходзіць разам з усімі дарослымі на згоны ці гвалты (усеагульныя тэрміновыя работы) на панскі палетак. Сялянскі хлопец станавіўся канчаткова дарослым ва ўзросце 18 год і лічыўся тады прыдатным да ўсякай работы (а галоўнай мужчынскай працай у сялянскай супольнасці лічылася ворыва). У гэтым узросце ён таксама ўжо мог ажаніцца і пры пэўных абставінах (калі паміраў бацька ці старэйшыя браты) стаць паўнавартасным гаспадаром, што давала яму права ўдзельнічаць у грамадскіх сходах з поўным правам голасу. Гэта азначала і аўтаматычнае

выйсце з групы моладзі. Верхняя ўзроставая мяжа не была дакладна акрэслена. Для мужчын істотнае значэнне мела дасягненне ўзросту 30 год, калі іх ужо не маглі браць у рэкруты (да ўвядзення ўсеагульнай вайсковай павіннасці ў 1874 г.).

Гэты перыяд маладосці паміж дзяцінствам і дарослым жыццём, якое пачыналася з жаніцьбы, у беларускім вясковым грамадстве часта называлі «кавалеркай». Моладзі многае дазвалялася, лічылася, што ёй трэба трохі «пашалець», «вышумецца». Таму маладзёны шмат часу праводзілі на забавах, учынялі розныя жарты сваім аднавяскоўцам, адыгрывалі галоўную ролю ў традыцыйных вясковых святах. Часам маладыя хлопцы аб'ядноўваліся ў своеасаблівыя «банды», якія пачыналі тэрарызаваць усю ваколіцу. Пісьменнік Аляксей Карпюк пісаў пра маладыя гады свайго бацькі і яго сяброў, што тыя дакучалі старэйшым гаспадарам сваімі жарцікамі: «(…) зацягвалі на ліпу якому-небудзь дзядзьку сані альбо затыкалі снопікам удаве комін ды ішлі да цёткі патрабаваць выкуп», а таксама «ўзброеныя бязменамі і нажамі (…) урываліся на музыкі, разганялі сапернікаў» [1, с. 13].

Гэтыя «банды моладзі» станавіліся важным элементам штодзённага жыцця вёскі ў пераходны перыяд ад традыцыі да мадэрнасці. Часам яны ўтваралі даволі згуртаваныя групы з некалькі дзесяткаў хлопцаў, якія мелі сваю ўласную іерархію. Лідары гэтых груп нярэдка паходзілі не з самых заможных гаспадарак, але імпанавалі сваім аднагодкам адвагай і тым смелым выклікам, які яны кідалі прызнаным у вёсцы аўтарытэтам (а такімі звычайна былі самыя заможныя гаспадары). Фарміраванне такіх маладзёжных банд з'яўлялася важным сімптомам надыходзячага распаду традыцыйнай сістэмы сацыяльнага жыцця [2, s. 55]. Моладзь пераставала быць паслухмянай старэйшым узроставай групай, пакорна і цярпліва чакаючай сваю чаргу ў эстафеце пакаленняў. Значная яе частка ставала ў выразную апазіцыю да пануючых нормаў і звычаяў, ствараючы тым самым новую лінію канфлікту ў штодзённасці вясковага жыцця [3, s. 124]. Паводзіны вясковай моладзі ў паслярэформенныя гады станавіліся ўсё болей праблемным пытаннем і ўсё часцей звярталі ўвагу даследчыкаў і публіцыстаў. У газеце «Наша Ніва» Аляксандр Уласаў у артыкуле «Аб вясковай хуліганшчыне» ў 1912 г. пісаў: «Маладзёж ужо не тое, што іх забітые працай, заціснутые жыццём бацькі і дзяды, у каторых была адна думка; пакорнасць сваей безпраўнай долі і абы як-небудзь прахарчавацца да вясны» [4, с. 2]. Адзін з карэспандэнтаў беларускамоўнай каталіцкай газеты «Bielarus» Рыгор Кляновіч пісаў у перадваенным 1913 г., што «z usich bakou Biełarusi można ciapier paczuc sztoraz to czaściejszyja narakańnia na swawolu naszaj moładzi». Паводле гэтага аўтара старэйшыя людзі гаварылі, што «nikoli hetkich szalmastwau pa wioskach nie bywała» [5].

Пачынае фарміравацца ў сялянскім асяроддзі ў гэты перыяд і арганізаваная злачыннасць. Першай айчыннай «мафіяй» на беларускіх



землях можна лічыць шайкі канакрадаў. Баляслаў Грабінскі ў сваіх успамінах пра Сакольшчыну адзначаў, што ў другой палове XIX ст. паўстала там добра арганізаванае канакрадства (крадзеныя коні пераводзіліся праз Аўгустоўскую пушчу ў Прусію), якое пратрымалася аж да Першай сусветнай вайны» [6, с. 181]. Гэта пацвярджаюць матэрыялы дзяржаўнай адміністрацыі, для якой барацьба з канакрадствам стала важным кірункам паліцыйнай дзейнасці. Стваральнікамі арганізаванай злачыннасці на беларускіх землях выступалі пераважна не сяляне-беларусы, а яўрэі, рускія стараверы і цыганы. Гэтыя этнічныя групы мелі шырока разгалінаваную надлакальную сетку дынамічных сувязяў і інфармацыйных патокаў, якія маглі з поспехам выкарыстоўвацца і крымінальным элементам. Але да іх паступова ўсё больш актыўна далучаюцца і сяляне, пераважна маладыя мужчыны. Фактычна ў кожнай мясцовасці ў канцы XIX – пачатку XX ст. з'яўляюцца злачынныя шайкі, сярод удзельнікаў якіх ёсць і сяляне. Адам Багдановіч у сваіх успамінах апісвае постаць селяніна Якава з Акімаўкі. Заснаваная ім банда доўгі час тэрарызавала ўсю ваколіцу, «поджигая гумна и дома тех, с кем имел (Якаў – *С. Т.*) счеты». Багдановіч адзначаў, што «по нашим местам он был первый бандит из белоруссов» [7, с. 131–132].

У маладых сялянскіх хлопцаў у гэты перыяд з'явілася новая магчымасць жыццёвага шляху – шляху «рэвалюцыянера», бунтара, баявіка. Стаўленне вясковых супольнасцяў да такіх асобаў не было адназначным. Такі тып быў у цэлым запатрабаваны вёскай у яе змаганні за зямлю і ўсё больш жорсткіх канфліктах сялян з памешчыкамі і ўладамі, якія часта заканчваліся сутыкненнямі з паліцыяй і войскам. Той, хто першы шпурляў камень, адважна кідаўся на паліцыю ці салдат, заваёўваў сабе прэстыж і высокі маральны статус у вачах аднавяскоўцаў. З другога боку, гэтыя бунтары маглі і сілай навязваць грамадзе сваё светабачанне, тэрарызаваць тых вяскоўцаў, хто быў з імі нязгодны.

Цяжкім выпрабаваннем у жыцці маладых хлопцаў у першыя парэформенныя гады заставаўся рэкруцкі набор, хаця тэрміны вайсковай службы ўжо ў 1860-я гг. моцна скараціліся (забіралі ў войска «ўсяго» на 7 год, пасля якіх былых салдат пераводзілі ў разрад адстаўных ніжніх чыноў). Цяпер валасныя ўлады, а не панскі двор, адказвалі за набор рэкрутаў, які не страціў сваёй ранейшай жорсткасці. Адам Багдановіч успамінаў, што «хватали разумеется, тех, кто всего менее этого ожидал (…) заковывали в колоды и сковывали руки сзади». Калі камусьці з рэкрутаў удавалася ўцякаць, дапамагаць такім уцекачам, як пісаў Багдановіч, «всякий считал своим долгом, не входя в рассуждения, что из этого выйдет» [8, с. 78]. Увядзенне ўсеагульнай вайсковай павіннасці ў 1874 г. яшчэ больш скараціла тэрміны службы, але яна цяпер ахоплівала куды большую частку вясковай моладзі. Паволі адыход сялянскага хлопца ў войска перастаў успрымацца ім самім і яго блізкімі як жыццёвая трагедыя. Канешне, вайсковая служба па-

ранейшаму заставалася цяжкім выпрабаваннем для вясковых хлопцаў і іх сем'яў, але таксама пашырала іх далягляд і садзейнічала інтэлектуальнаму развіццю.

У паслярэформенны час паправіліся фізічныя кандыцыі сялянскай моладзі. Паводле праведзенага параўнаўчага даследавання росту рэкрутаў Гродзенскага павета за 1869 г. і навабранцаў 1913 г., у першым выпадку сярэдні рост складаў 162,5 см, а ў другім – 164,5 [9], што служыць на карысць гіпотэзы аб павышэнні сярэдняга росту сялян Беларусі ў паслярэформенны час. Напрыклад, рост рэкрутаў у царскае войска з земляў Каралеўства Польскага, паводле падлікаў польскіх гісторыкаў, таксама ўзрос з 163,3 см у 1866 г. да 166,2 см у 1913 г. [10, s. 230].

Час «кавалеркі» для большасці сялянскай моладзі не мог быць вельмі працяглым. Напрыклад, у сельскай мясцовасці Магілёўскай губерні паводле статыстычных дадзеных за 1871–1881 гг. прыкладна палова дзяўчат выходзіла замуж ва ўзросце да 20 год, а сярод мужчын – ва ўзросце да 25 год [11, c. 9] (табліца 1).

*Табліца 1*

**Узрост уступлення ў шлюб у сельскай мясцовасці**
**Магілёўскай губерні ў 1871–1881 гг. (на 1000 шлюбаў) [11, c. 9]**

| Узрост | 15–19 | 20–24 | 25–29 | 30–34 | 35–39 | 40–44 | 44–49 | 50 і болей |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Мужчыны | 269 | 364,5 | 157,3 | 74,7 | 49,4 | 35,9 | 25,3 | 23,9 |
| Жанчыны | 491,3 | 321,6 | 78,6 | 42,9 | 30,6 | 19 | 10,5 | 5,5 |

У «Памятнай книжцы Віцебскай губерні на 1889 г.» адлюстравана яшчэ і канфесійная спецыфіка ў гэтым пытанні (табліца 2). Сярод праваслаўных жыхароў сельскай мясцовасці Віцебскай губерні, якія бралі шлюб у 1887 г., 44 % жанчын выходзілі замуж ва ўзросце да 20 год, сярод каталічак гэты паказчык быў трохі ніжэйшы – 37,6 %. Усяго 13,9 % жанчын праваслаўнага вызнання выходзілі ў 1887 г. замуж пасля 25 год, сярод каталічак – 16,7 % [12, c. 65]. Паводле статыстыкі Віцебскай губерні за 1893 г. сярод жанчын 41 % выходзілі замуж ва ўзросце да 20 год і 25 % – пасля 25 год [13, c. 198].

Мікрагістарычнае даследаванне Глыбоцкага праваслаўнага прыхода на памежжы Віленскай і Гродзенскай губерняў паказвае, што сярэдні ўзрост уступлення ў шлюб у гэтым прыходзе за перыяд 1843–1914 гг. прынцыпова не змяняўся і вагаўся каля лічбаў 25 год для хлопцаў і 22 гады для дзяўчат [14]. Насельніцтва дадзенага прыхода выступае прыкладам той часткі беларускага сялянства, якое не змяняла стратэгіі пабудовы сям'і ў паслярэформенныя гады, хаця, паводле дадзеных польскага даследчыка Эдмунда Пясецкага, у Бейскай парафіі Кялецкай губерні Каралеўства Польскага ўзрост уступлення ў шлюб падвышаўся на працягу другой паловы XIX ст.:



у 1861–1870 гг. ён складаў 23,5 года для мужчын і 20,86 – для жанчын, а ў 1891–1900 гг. – адпаведна 25,24 і 22,38 [10, s. 142–143]. Але паказчыкі шлюбнасці (колькасці шлюбаў на тысячу жыхароў) у беларускай вёсцы паволі зніжаліся. На гэта ўплывалі ўсё большае развіццё адыходніцтва на заробкі і міграцыя моладзі ў гарады.

*Табліца 2*

**Узрост уступлення ў шлюб сярод праваслаўнага і каталіцкага**
**насельніцтва Віцебскай губерні за 1887 г. (на 1000 шлюбаў) [12, c. 64–65]**

| | | Праваслаўныя | Каталікі |
|---|---|---|---|
| 15–19 | М | 610 | 32 |
| | Ж | 2147 | 685 |
| 20–24 | М | 2178 | 557 |
| | Ж | 2044 | 854 |
| 25–29 | М | 1270 | 679 |
| | Ж | 370 | 179 |
| 30–34 | М | 282 | 254 |
| | Ж | 120 | 62 |
| 35–39 | М | 194 | 146 |
| | Ж | 71 | 29 |
| 40–44 | М | 113 | 62 |
| | Ж | 48 | 19 |
| 45–49 | М | 106 | 47 |
| | Ж | 41 | 12 |
| 50 і болей | М | 118 | 43 |
| | Ж | 29 | 7 |

Сярод сялян, старэйшых за 30 год, халастыя асобы сустракаліся ў беларускай вёсцы вельмі рэдка. Звычайна прычынай гэтаму выступалі нейкія фізічныя ці разумовыя недахопы альбо беднасць. У традыцыйным сялянскім грамадстве правіла абавязвала, што лепей дрэнна жаніцца, чым ніяк.

Вельмі важным пытаннем з'яўляецца вызначэнне крытэрыяў выбару шлюбнага партнёра ў сялянскай супольнасці. У часы паншчыны рашэнне часта прымаў сам уладальнік маёнтка, ці, па меншай меры, яго дазвол быў неабходны ў тым выпадку, калі нявеста ці жаніх паходзілі з ліку сялян чужога маёнтка. Праведзены аналіз метрычных кніг Глыбоцкага прыхода паказвае, што тут у дарэформенны перыяд зусім адсутнічалі шлюбы паміж сялянамі прыватнаўласніцкіх і казённых вёсак, якія ўваходзілі ў гэты прыход. У парэформенную эпоху дыктат пана знікае, і сяляне самі павінны былі прымаць рашэнне адносна выбару шлюбнага партнёра. У апісанні Магілёўскай губерні за 1881 г. сцвярджалася, што ў сялянскіх жаніцьбах

самыя маладыя мелі мала свабоды выбару: «Сговоры за жениха и невесту идут между стариками (…) о приданном хлопочут мало, им нужны работники и работницы, и потому "хлопцев" спешат женить, а матери дочерей напротив стараются удержать в доме подольше» [15, с. 482].

У паслярэформенныя гады ўзрастае роля эканамічных чыннікаў. Бацькі імкнуліся забяспечыць маладую пару такой уласнасцю, каб яны ў будучым маглі стварыць самастойную гаспадарку. Звычайна нявестку для маладога хлопца падбіралі з сям'і прыкладна аднолькавай заможнасці. Гэта не тычылася паўторных шлюбаў, калі пажылыя заможныя ўдаўцы нярэдка жаніліся на маладзейшых, але бедных дзяўчатах. Але пра дыктат бацькоў у выбары шлюбнага партнёра ў беларускай вёсцы гаварыць нельга. Шлюбы ў сялянскім асяроддзі ў парэформенны час пераважна адбываліся са згоды маладых: «Хлопец ці дзяўчына выбіралі сабе пару пераважна па асабістых сімпатыях. Бацькі, уважаючы на багацце жаніха або нявесты, спрабавалі ўплываць на дзяцей, але вырашала справу ўсё ж сама моладзь» [16, с. 63]. Іван Карскі падкрэсліваў нязначнасць пачуццёвага боку ў выбары шлюбнага партнёра: «Женятся наши крестьяне большею частью без всякой любви» [17, с. 95]. Аднак, хаця матэрыяльны статус жаніха і нявесты звычайна адыгрываў галоўную ролю, асабістыя пачуцці таксама мелі немалаважнае значэнне і браліся пад увагу. Як сцвярджаў Доўнар-Запольскі, эканамічныя меркаванні «не мешают, однако, тому, чтобы браки совершались по влечению молодых» [18, с. 138].

Фактар кахання ў сённяшнім разуменні гэтага тэрміна рэдка ўзгадваецца ў крыніцах, хаця Эмма Яленская сцвярджала, што «можа і досыць рэдка, праўдзівае і глыбокае каханне з'яўляецца сярод нашых вяскоўцаў» [19, s. 325]. Маральныя якасці маладых таксама браліся пад увагу. Але ўсё ж яны ішлі на другім месцы пасля матэрыяльнага фактара. Праваслаўны святар Аляксей Ваўкавыцкі пісаў пра свіх прыхаджан: «Примеры нецеломудрия под покровом родительского дома очень редки, большей вольностью отличается жизнь тех, кои состоят на службе (…) Девушка, лишившая себя целомудрия, находится в большом презрении как у соседей, так особеннно у своих родных. Замужество для нея раз и навсегда делается невозможным» [20, s. 74]. Сцверджанне святара Ваўкавыцкага, што для саграшыўшых дзяўчат назаўсёды закрывалася дарога да шлюбу, з'яўляецца яўным перабольшаннем. Матэрыялы метрычных кніг і рэвізскіх сказак сведчаць адваротнае. Таксама пазашлюбныя дзеці мелі шанец стварыць сям'ю і ўласную гаспадарку. Галоўную ролю тут адыгрываў матэрыяльны статус іх сям'і. Ды і сялянская грамада не падтрымлівала найбольш жорсткія санкцыі адносна такіх асоб. Мікалай Улашчык прыводзіць выпадак з жыцця вёскі Грычын, што калі дзяўчына нарадзіла там пазашлюбнае дзіця, і бацька выгнаў яе з хаты, дык аднавяскоўцы за ноч (так патрабаваў закон) паставілі для бядачкі хатку, дзе яна змагла прытуліцца [16, с. 64–65].



У даследаваным аўтарам Глыбоцкім прыходзе за 1870–1902 гг. адбылося 19 шлюбаў, дзе адзін з маладых (6 жаніхоў і 13 нявест) з'яўляўся незаконнанароджаным. Гэта складала 1,6 % ад усіх шлюбаў у прыходзе за гэты перыяд (1188) [14]. Калі супаставіць з паказчыкамі нараджэнняў, то можна сцвярджаць, што шанцы незаконнанароджаных сялян на стварэнне сям'я мала адрозніваліся ад іншых дзяцей. Новай з'явай можна лічыць тое, што сямейныя адносіны паміж сялянамі цяпер нярэдка атрымлівалі адпаведнае пісьмовае афармленне. У якасці прыкладу можна прывесці пісьмовую дамову гаспадара вёскі Берніты Мікалая Мышкевіча са сваім зяцем-прымаком Іванам Лебядзевічам, складзеную ў валасным праўленні ў 1897 г. У гэтай дамове Мышкевіч прызнаваў, што сам ужо не ў стане весці гаспадарку, а мае толькі чатырох дачок, старэйшую з якіх ён і выдаваў за Лебядзевіча. Апошні атрымліваў роўныя правы на кіраванне гаспадаркай з сваім цесцем, а таксама абавязваўся даглядаць яго і цешчу да самай смерці і годна пахаваць, а сваіх трох швагерак выдаць замуж, забяспечыўшы адпаведным пасагам, памер якога дакладна агаворваўся ў дамове [546, арк. 119]. Ад самога ж Лебядзевіча не патрабавалася ніякага матэрыяльнага ўкладу ў новую гаспадарку, апроч сваёй працы. Кроўныя сваякі Мышкевіча маглі тэарэтычна выдаліць прымака з зямлі, прынамсі тэкст дамовы гэткую магчымасць прадугледжваў, але ў такім разе за кожны год гаспадарання павінны былі б выплаціць яму і яго жонцы па 30 руб. серабром, альбо 200 руб. адзінаразова.

У мадэлі сацыялізацыі вясковай моладзі ў паслярэформенны перыяд адбываюцца істотныя змены. Галоўнай зменай стаў рух у кірунку індывідуалізацыі. Моладзь становіцца больш незалежнай ад старэйшага пакалення. У яе з'яўляюцца магчымасці да самарэалізацыі па-за роднай вёскай і бацькоўскай гаспадаркай. Узрастае роля моладзі ў грамадскім жыцці вёскі. Яе прадстаўнікі асабліва ахвотна ўспрымаюць радыкальныя сацыяльныя ідэі і далучаюцца да рэвалюцыйнага руху.

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. *Карпюк, А.* Выбраныя творы: у 2 т. / А. Карпюк. – Мінск: Маст. літ-ра, 1991. – Т. 1. – 538 с.

2. *Thomas, W. I.* Chłop polski w Europie i Ameryce / W. I. Thomas, F. Znaniecki. – Warszawa: Ludowa Spółdzielnia Wydawnicza, 1976. – T. 4: Dezorganizacja i reorganizacja w Polsce. – 204 s.

3. *Mędrzecki, W.* Młodzież wiejska na ziemiach Polski centralnej 1864–1939: Procesy socjalizacji / W. Mędrzecki. – Warszawa: DIG, 2002. – 212 s.

4. Аб вясковай хуліганшчыне // Наша Ніва. – 1912. – № 51–52. – С. 2.

5. *Klonowicz, R.* Pa naszych wioskach / R. Klonowicz // Bielarus. – 1913. – № 32. – 30 kastrycznika. – L. 1–2.

6. *Грабінскі, Б.* Сакольшчына – Горадня – Вільня / Б. Грабінскі // ARCHE. – № 5. – 2000. – С. 179–208.

7. *Богданович, А.* Мои воспоминания / А. Богданович // Неман. – 1984. – № 8. – С. 67–136.

8. *Богданович, А.* Мои воспоминания / А.Богданович // Неман. – 1984. – № 7. – С. 21–87.

9. Обзор Гродненской губернии за 1913 год. – Гродно: Губерн. тип., 1913. – 115 с., [28] л. табл.

10. *Piasiecki, E.* Ludność parafii biejskiej (woj. kieleckie) w świetle ksiąg metrykalnych XVIII–XX w.: studium demograficzne / E. Piasiecki. – Warszawa, Wrocław: PWN, 1990. – 373, [2] s.
11. Опыт описания Могилевской губернии в историческом, физико-географическом, этнографическом, промышленном, сельско-хозяйственном, лесном, учебном, медицинском и статистическом отношениях: в 3 кн. / А. С. Дембовецкий; сост. по прог. и под ред. А. С. Дембовецкого. – Могилев-на-Днепре: тип. губерн. правл. 1882–1884. – Кн. 3. – 1884. – 382 с.
12. Памятная книжка Витебской губернии на 1889 г. – Витебск: Губерн. тип., 1889. – 371, 149, XLI с.
13. Памятная книжка Витебской губернии на 1895 г. – Витебск: Губерн. тип, 1895. – VII, 248, 59, XIV с.
14. *Токць, С.* Нараджальнасць і смяротнасць у традыцыйнай сялянскай супольнасці Беларусі XIX – пачатку XX ст. (па матэрыялах Глыбоцкага прыхода) / С. Токць // Белар. гіст. часоп. – 2014. – № 11. – С. 14–22.
15. Опыт описания Могилевской губернии в историческом, физико-географическом, этнографическом, промышленном, сельско-хозяйственном, лесном, учебном, медицинском и статистическом отношениях: в 3 кн. / А. С. Дембовецкий; сост. по прог. и под ред. А. С. Дембовецкого. – Могилев-на-Днепре: Тип. губерн. правл., 1882–1884. – Кн. 1. – 1882. – 693 с.
16. *Улашчык, М.* Выбранае / М. Улашчык; уклад. А. Каўкі і А. Улашчыка; навук. рэд. Г. Кісялёў і В. Скалабан. – Мінск: Беларус. кнігазбор, 2001. – 608 с.
17. Материалы для изучения быта и языка русскаго населения Северо-Западнаго края. Собранные и приведенныя въ порядок П. В. Шейномъ. – СПб.: Тип. Император. акад. наук, 1887–1902. – Т. III: Описание жилища, одежды, пищи, занятий; препровождение времени, игры, верования, обычное право; чародейство, колдовство, знахарство, лечение болезней, средства от напастей, поверья, суеверья, приметы и т. д. – 1902. – IV, 535 с.
18. *Довнар-Запольский, М.* Заметки из путешествия по Белоруссии. 1890–1891 / М. Довнар-Запольский // Homo historicus 2009. Гадавік антрапалагічнай гісторыі / пад рэд. А. Ф. Смалянчука. – Вільня: ЕГУ, 2010. – С. 123–206.
19. *Jeleńska, E.* Wieś Komarowicze w powiecie mozyrskim / przez E. Jeleńskę // Wisła. – 1891. – T. 5, Z. 2. – S. 290–330.
20. *Wołkowycki, A.* Historyczny oraz statystyczny opis cerkwi i parafii w Czarnej Cierkiewnej / A. Wołkowycki. – Czarna-Cierkiewna-Bielsk-Podlaski: Rada Diecezjalna Bractwa Młodzieży Prawosławnej Diecezji Warszawsko-Bielskiej, 1994. – 89 s.
20. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў Гродне. – Фонд 84 . – Воп. 2. – Спр. 6. – Арк. 119.

**(Дата подачи: 21.01.2015 г.)**

*В. М. Хованский*
Военная академия Республики Беларусь, Минск
*V. M. Khavanski*
The Military Academy of the Republic of Belarus, Minsk

**УДК 355.1(476)/07.00.02**

# ИСТОРИОГРАФИЯ СТАНОВЛЕНИЯ И РАЗВИТИЯ СИСТЕМЫ ИДЕОЛОГИЧЕСКОЙ РАБОТЫ В ВООРУЖЕННЫХ СИЛАХ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ В ПЕРИОД 1991–2006 ГОДОВ



# HISTORIOGRAPHY OF FORMATION AND DEVELOPMENT SYSTEM OF IDEOLOGICAL WORK IN BELARUSIAN ARMED FORCES (1991–2006)

*В статье рассматривается историография становления и развития системы идеологической работы в Вооруженных Силах Республики Беларусь в период 1991–2006 гг., раскрывается роль этой историографии в изучении, систематизации, использовании опыта идеологической работы, проблемы и достижения в указанной сфере.*
*Ключевые слова: система идеологической работы; Вооруженные Силы; историография.*

*The article deals with historiography of formation and development system of ideological work in Belarusian Armed Forces (1991-2006), the main problems and achievements.*
*Key words: system of ideological work; the Armed Forces; historiography.*

В ситуации нарастающего информационно-психологического противоборства значение духовной составляющей неуклонно возрастает. Не случайно указанному вопросу с момента появления в Республике Беларусь первой редакции Концепции национальной безопасности и до настоящего времени уделялось особое внимание. В частности, на важность упомянутого аспекта указывает и содержание утвержденной Указом Главы государства № 575 в 2010 г. Концепции национальной безопасности, где сделан акцент на защиту традиций и аксиологических основ существования общества, подчеркивается значение развития патриотизма в целях обеспечения национальной безопасности государства [1, с. 21].

В данном контексте представляется закономерным, что особое место в системе проблем военной теории и практики занимает постижение значения, сущности, закономерностей, принципов, методов и форм организации идеологической работы [2, с. 327]. Это вполне обосновано, поскольку к числу приоритетных функций идеологической работы относится управление духовными процессами в армии и реализация идеологии обеспечения военной безопасности в сфере духовной жизни общества, что, в свою очередь, достигается посредством воспитательной, информационно-пропагандистской, психологической работы, социально-правовой, социокультурной, информационной и контрпропагандистской деятельности [3].

Одним же из условий совершенствования системы идеологической работы в Вооруженных Силах Республики Беларусь (далее – Вооруженные Силы) является осмысление и извлечение уроков из опыта идеологической и организаторской деятельности органов военного управления по претворению в жизнь политики белорусского государства в области идеологии. В этой связи не вызывает сомнений актуальность и полезность изучения исторического наследия в указанной сфере.

Исследование истории той или иной проблемы базируется в том числе на изучении соответствующей историографии. Следовательно, цель статьи – проанализировать взгляды экспертов на проблему формирования системы идеологической работы в Вооруженных Силах в интересах реали-